25—27 мая 1966 года ў Крамлі праходзіў Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум ЦК КПСС абмеркаваў пытанне «Аб шырокім развіцці меліярацыі зямель для атрымання высокіх і ўстойлівых ураджаяў збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур.»

На Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 19 (642) Пятніца, 3 чэрвеня 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## ДАВЕР'Е НАРОДА

СВЯТОЧНЫ настрой панаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Ул. І. Леніна, калі для сустрэчы з выбаршчыкамі прыбыў член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР таварыш К. Т. Мазураў.

Актавая зала перапоўнена. З'яўленне ў прэзідыуме члена Палітбюро ЦК КПСС, першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазурава, кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КП Беларусі П. М. Машэрава, Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва, першага сакратара Мінскага абкома КПБ І. Я. Палякова прысутныя сустракаюць дружнымі апладысментамі.

Слова атрымлівае даверанная асоба І. А. Карабань. Спыняючыся на біяграфіі кандыдата ў дэпутаты, ён характарызуе Кірыла Трафімавіча як вернага сына Радзімы, нястомнага барацьбіта за шчасце народа, віднага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Гарачым адабрэннем сустракаюць прысутныя заяву аб тым, што студэнты, выкладчыкі, усе работнікі БДУ ў Дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР выканаюць свой грамадзянскі абавязак і аднадушна прагаласуюць за свайго дастойнага кандыдата ў дэпутаты — таварыша К. Т. Мазурава.

На трыбуне студэнтка філалагічнага факультэта Ірына Шумко.

— У студэнцкай моладзі нашага ўніверсітэта, — гаворыць яна,— добры, святочны настрой. Мы, савецкая моладзь, бясконца шчаслівыя. што нарадзіліся і жывём у краіне, якая першай у гісторыі чалавецтва здзейсніла сацыялістычную рэвалюцыю, першая пабудавала сацыялізм і першая пракладвае шлях да камунізма. Мы штодзённа адчуваем бацькоўскія клопаты Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб моладзі, аб яе фізічным развіцці і духоўным росце.

Партыя ўскладае на студэнцтва вялікія надзеі, яна бачыць у нас не толькі будучых спецыялістаў, але і выхавацеляў шырокіх мас працоўных, носьбітаў культуры. Студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна прыкладаюць усе сілы да таго, каб глыбока авалодаць марксісцка - ленінскай тэорыяй, дасягненнямі навукі і практыкі.

Мы горача вітаем тут, у гэтай зале віднага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада Кірыла Трафімавіча Мазурава. Студэнты нашага ўніверсітэта ў Дзень выбараў прыйдуць на выбарчыя ўчасткі і з радасцю аддадуць свае галасы за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР — верных сыноў і дачок нашай партыі.

Выступае дацэнт С. А. Лысенка.

— З вялізарнай зацікаўленасцю і хваляваннем, — гаворыць яна,— сачылі мы за работай XXIII з'езда КПСС. Тое, што абмяркоўвалася на з'ездзе, блізкае і дарагое нам. Вышэйшы орган партыі падвёў вынікі пройдзенага шляху, намеціў баявую праграму дзеянняў на будучыню. Менш як два тыдні застаецца да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Усюды вядзецца актыўная падрыхтоўка, натхненная праца кіпіць на роднай зямлі. Партыя кліча нас на барацьбу за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, за датэрміновае выкананне новай пяцігодкі, якая з'явіцца важным крокам на шляху да камунізма. Палітыка партыі — гэта наша палітыка. Яе аднадушнай падтрымкай будуць нашы галасы, аддазеныя за вернага сына нашага народа Кірыла Трафімавіча Мазурава.

— Мы вельмі рады,— сказаў доктар фізіка-матэматычных навук Л. В. Валодзька,— што Кірыл Трафімавіч Мазураў згадзіўся з просьбай землякоў прадстаўляць іх інтарэсы ў вышэйшым заканадаўчым органе Савецкай дзяржавы. Разам з беларускім народам ён дзяліў нягоды вайны, цяжкасці аднаўленчага перыяду і радасці стваральнай працы.

На сходзе выступілі таксама рэктар БДУ А. Н. Сеўчанка і сакратар камітэта камсамола універсітэта Г. Я. Рылюк.

На сходзе, цёпла сустрэты прысутнымі, выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР К. Т. Мазураў.

(БЕЛТА).





*НА ЗДЫМКАХ: Актавая зала ўніверсітэта. Член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, кандыдат у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР К. Т. Мазураў выступае перад выбаршчыкамі.*

## У НАС, НА АГІТПУНКЦЕ

Работа агіткалектыва, як і ўсякая вялікая справа, залежыць не толькі ад таго, як яна накіроўваецца, але і ад таго, як працуюць агітатары кожны паасобку.

Наш агіткалектыў складаецца з васьмідзесяці чалавек. Кіруюць ім камуністы. Іх у агіткалектыве пяцьдзесят два чалавекі. Побач з камуністамі актыўна працуюць па прапагандзе рашэнняў Партыі і Урада камсамольцы. Іх у калектыве дзесяць чалавек. Пад уплывам камсамольцаў і камуністаў, у цеснай з імі сувязі, добра вядуць грамадскую работу і беспартыйныя члены агіткалектыва. Шчыра гаворачы, увесь калектыў — гэта добрасумленныя людзі, якія валодаюць не толькі высокай эрудыцыяй, але і маюць вопыт грамадскай работы.

Кожную сераду на агітпункце збіраюцца агітатары, каб пагаварыць аб сваіх справах, абмяняцца вопытам са зробленай работы, намеціць планы на будучае. На нарадах, якія праводзяцца з агітатарамі, абмяркоўваюцца пытанні прапаганды рашэнняў XXIII з'езда КПСС, падрыхтоўкі спісаў выбаршчыкаў, аб правядзенні з выбаршчыкамі індывідуальнай прапагандысцкай работы, аб арганізацыі на агітпункце дзяжурстваў, аб правядзенні рознастайных гутарак.

Агітатарамі праведзены ўжо гутаркі з выбаршчыкамі на тэмы: «Рашэнні XXIII з'езда КПСС—баявая праграма барацьбы савецкага народа ў будаўніцтве камунізма», «Пяцігадовы план—новы важны этап стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма», «XXIII з'езд КПСС аб далейшым павелічэнні матэрыяльнага ўзроўню савецкага народа», «Перспектывы развіцця БССР у новай пяцігодцы», «Вярхоўны Савет СССР—вышэйшы орган дзяржаўнай улады», «Дэмакратычныя прынцыпы савецкай выбарчай сістэмы».

Добра зарэкамендавалі сябе агітатары геаграфічнага факультэта Л. Пауловіч, Л. Фогач, О Мельнікаў, І. Кудла, М. Лаўрыновіч, М. Алісевіч, Т. Кузьміна, Н. Гануровіч, біялагічнага факультэта—С. Паўлюкевіч, І. Дзясяцік, юрыдычнага факультэта—А. Канаплянік, А. Ляўшын, Л. Сяргейчык, В. Сухоцкі, В. Разумаў, В. Грэчка і іншыя.

Зараз, як і па-ранейшаму перад агітатарамі стаіць задача: даводзіць да сваіх падшэфных «Зварот ЦК КПСС да выбаршчыкаў», разгарнуць агітацыю за кандыдатаў у Савет Саюза і Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР.

**С. ДРАБЯЗКА,**
**загадчык агіткалектыва.**

## ПОСПЕХ ПРЭМ'ЕРЫ

На днях у актавай зале ўніверсітэта адбылася прэм'ера спектакля амерыканскага драматурга Артура Лаўрэнтса «Вестсайдская гісторыя». Аб поспеху, які атрымаў спектакль, яскравей усяго гаварылі апладысменты глядачоў. Пасля заканчэння спектакля прысутныя, больш пяці мінут, стоячы, апладыравалі артыстам. Пастаноўку спектакля ажыццявіў засл. арт. Латвійскай ССР А. М. Озераў. Выканаўцы — удзельнікі студэнцкага тэатра БДУ.

## СТУДЭНТЫ—ВОІНАМ

Дружбе, якая завязалася паміж студэнтамі нашага універсітэта і воінамі аднаго з падраздзяленняў мінскага гарнізона застаецца толькі пазайздросціць.

Невялікія творчыя абмены мастацкай самадзейнасці паміж воінамі і студэнтамі філалагічнага факультэта перараслі паступова ў моцную і трывалую сувязь.

Напярэдадні Дня Перамогі нашы студэнты паказалі сваім сябрам-воінам вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Воіны засталіся задаволенымі не толькі канцэртам, але і тымі пажаданнямі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы, якія выказалі ім госці.

У заключэнне сустрэчы воіны выказалі гасцям сваю ўдзячнасць і жаданне сустракацца часцей.

**А. Казельскі.**

## ТОЛЬКІ НА «ВЫДАТНА»

Ларысе Краўчанка, Ірыне Шумко, Анатолю Гарбачову ёсць чым парадавацца. Першы экзамен і першыя пяцёркі.

Часам нават здзіўляешся, як толькі яны паспяваюць спалучаць грамадскую работу з выдатнай вучобай. Усе трое—члены камітэта камсамола філфака. Здаць сесію на «выдатна» для Ларысы, Ірыны і Анатоля—толькі першы крок. Сесію трэба здаць яшчэ і датэрмінова, бо ўсе яны—байцы цаліннага атрада.

Не менш клопатаў і ў Віктара Захарчука, студэнта другога курса аддзялення журналістыкі. Ён таксама паедзе на цаліну. Віктар здае сесію на «добра» і «выдатна».

Не адстаюць ад сваіх таварышаў і першакурснікі В. Кавалёў і Л. Карасёва. У іх заліковых кніжках з'явіліся першыя пяцёркі. У іх ёсць усе мажлівасці закончыць першы курс з выдатнымі паказчыкамі.

Сесія пачалася. І прыемна тое, што яна дала ўжо першыя добрыя вынікі.

Я. ЦІТОВІЧ.

## КАМСАМОЛЬСКІЯ НАВІНЫ

Камітэт камсамола ўніверсітэта на сваім чарговым паседжанні разглядзеў становішча ўнутрысаюзнай работы на гістарычным факультэце. Работа камсамольскай арганізацыі гістфака прызнана «здавальняючай». Камітэту ўказана на недахопы, намечаны шляхі іх выпраўлення.

●

Група па вывучэнню маладзёжных праблем, якая створана пры камсамольскай арганізацыі аспірантаў біялагічнага факультэта, распрацавала тэматыку правядзення сацыялагічных даследаванняў. Камітэт камсамола ўніверсітэта рэкамендаваў тэматыку даследаванняў пярвічным камсамольскім арганізацыям факультэтаў.

## ЦІКАВАЯ ПАЕЗДКА

*Гэта паездка была адной з самых цікавых і хвалюючых. Больш пяцідзесяці чалавек: выдатнікаў вучобы, актывістаў ДТСААФ, камсамольскіх работнікаў нашага ўніверсітэта наведалі гераічную Брэсцкую крэпасць.*

*Шмат слаўных баявых і гістарычных старонак звязана з гэтым свяшчэнным месцам: Сувораў, Грыбаедаў, Карбышаў, Наганаў, Гаўрылаў, Фамін — каму толькі ў свеце невядомы гэтыя імёны. Аб мужнасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці складаюць песні, расказваюць легенды.*

*Свае знаёмства з гераічнымі месцамі нашы студэнты пачалі з агляду Кобрынскага гістарычнага музея імя А. В. Суворава. А потым — хвалюючая сустрэча з гераічнай цытадэллю, знаёмства з музеем крэпасці, з месцамі жорсткіх баёў, памятныя здымкі, набыццё сувеніраў. У кнізе водгукаў наведвальнікі пакінулі цёплы шчыры запіс. А перад тым, як пакінуць да наступнай сустрэчы гасцінную брэсцкую зямлю, нашы студэнты пабывалі яшчэ ў Брэсцкім краязнаўчым музеі.*

А. ЯРОХІН.

# СЕСІІ КРОКІ ЎПЭЎНЕННЫЯ



ВЯСЕННЯЯ экзаменацыйная сесія—адказны перыяд у жыцці студэнтаў. Яны трымаюць адказ перад партыяй, народам і савецкай дзяржавай аб зробленай рабоце за год, аб ведах, набытых у сценах універсітэта. Рыхтуючыся да экзаменаў, студэнты сістэматызуюць веды, атрыманыя на лекцыях, на практычных і семінарскіх занятках, узятыя з кніг і вучэбных дапаможнікаў.

У сваю чаргу прафесары і выкладчыкі не толькі экзаменуюць, але і глыбока аналізуюць сваю асабістую работу па выхаванню студэнтаў.

І вось сесія ўступіла ў свае правы. Ва універсітэце зараз гаворыць аб ёй усё; перапоўненыя чытальныя залы і доўга не затухаючыя па вечарах агні ў пакоях інтэрнатаў.

Каля аўдыторыі на «чарзе» да экзаменатара стаяць гісторыкі; ў апошні раз перагортваюць свае канспекты два сябры фізікі, а побач з імі—хімікі падкідваюць на «ура» першага пяцёрачніка.

Сесія прыйшла... На філалагічным факультэце яна пачалася экзаменам па гістарычнаму матэрыялізму, які здавалі журналісты-другакурснікі.

«Шчаслівыя» экзаменацыйныя білеты, майскія кветкі, хваляванне... Гэта часцей за ўсё перад самым пачаткам экзамена, пакуль, як кажуць студэнты, не выйдзе «першаадкрывальнік» экзамена.

І вось першыя «шчасліўцы»: Вячаслаў Дашкевіч і Людміла Барбук атрымалі выдатныя адзнакі.

...Першы экзамен, першае, «выдатна», першы ўклад у агульную скарбонку выдатных спраў факультэта, які змагаецца за камуністычныя адносіны да вучобы. Дэвіз усіх камсамольцаў універсітэта—«Вучыцца, жыць і працаваць па-камуністычнаму!».

Сур'ёзна і ўдумліва падыйшлі да гэтай сесіі студэнты ўсіх факультэтаў. Кожны імкнецца паказаць добрыя, трывалыя веды. Аб гэтым сведчаць вынікі першых экзаменаў і залікаў.

Асаблівай сур'ёзнасці, прынцыповасці і самадысцыпліны патрабуе цяперашняя сесія ад студэнтаў, якія ў хуткім часе будуць працаваць на цаліне. Трэба ў сціслыя тэрміны паспяхова здаць экзамены і залікі, правільна размеркаваць і скарыстаць час, адведзены на тую ці іншую дысцыпліну.

Гэтая важная задача выконваецца студэнтамі - цаліннікамі паспяхова. Фёдар Кулакоў, Іван Біблеў, Алег Слука, Аня Гонча і шмат іншых студэнтаў-цаліннікаў хутка будуць здаваць апошні экзамен. Іх заліковыя кніжкі запоўнены добрымі і выдатнымі ацэнкамі.

«Выдатна!» Такія адзнакі атрымалі пасля першых экзаменаў біёлаг Вася Піліпчык, гісторык Анатоль Кувала, хімікі Алена Ярэмчанка, Ларыса Аўчыннікава, дзяўчаты з геаграфічнага Валя Пракопчык, Ала Балука, Люся Папова, Валя Драгун.

Сухі і кароткі запіс у заліковай кніжцы. А за ім—карпатлівая лабараторная праца, незлічоная колькасць прачытаных кніг, бяссонных начэй.

Уладарна крочыць сесія па аўдыторыях філалагічнага факультэта, кабінетах геаграфічнага, лабараторыях фізікаў і хімікаў, па чытальных залах і кафедрах факультэтаў. Сустракай яе, студэнт, добрымі і трывалымі ведамі! Заўтра чарговы экзамен.

Ні пуху табе, сябар, ні пяра!

**А. Кадзет.**

*НА ЗДЫМКАХ: Валя ГУЦАЛ, з біялагічнага факультэта (верхні здымак), рыхтуе прэпарат да заліковай лабараторнай працы.*
*Ідзе залік па аналітычнай хіміі.*



## НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

Адбыліся чарговыя заняткі ў школе народных кантралёраў БДУ. З лекцыяй на тэму «XXIII з'езд КПСС і задачы органаў народнага кантролю вну» выступіў перад прысутнымі намеснік сакратара парткома ўніверсітэта, старшыня групы народнага кантролю дацэнт А. А. Галаўко.

На паседжанні группы народнага кантролю БДУ, якое адбылося 27 мая г. г., разгледжаны два пытанні:

аб становішчы пашпартнага рэжыму ва ўніверсітэце;

аб рабоце групы народнага кантролю падрыхтоўчага факультэта.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

# Слова штабу Ленінскай Эстафеты

Ленінская эстафета слаўных спраў, якую прынялі камсамольцы БДУ ў лютым гэтага года, прадугледжвае чатырохгадовы творчы паход моладзі за:

яшчэ больш настойлівае вывучэнне тэарэтычнай спадчыны Ул. І. Леніна;

за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў — будучых камандзіраў вытворчасці;

за выхаванне кожнага камсамольца нашай арганізацыі як актывіста грамадскіх спраў;

за ўсваенне высокіх маральных прынцыпаў кожным членам нашай арганізацыі на прыкладзе жыцця і дзейнасці правадыра.

Галоўным напрамкам Эстафеты з'яўляецца аднолькавае для ўсіх камсамольцаў і пярвічных арганізацый маральнае правіла: «Жыць, як Ленін!», «Працаваць, як Ленін!», «Вучыцца, як Ленін!»

У праграму Эстафеты ўваходзіць патрабаванне стапрацэнтнай паспяховасці камсамоліі універсітэта, авалоданне кожным камсамольцам групы навыкамі арганізатара грамадска-карысных спраў, ліквідацыя кожнай арганізацыяй выпадкаў амаральных паводзін.

Эстафета будзе праходзіць у выглядзе спаборніцтва паміж групамі, курсамі, факультэтамі.

У працоўны распарадак яе работы ўваходзіць: мець на кожным факультэце кіруючы «Штаб» ад 7 да 15 чалавек, зацверджанных камітэтам камсамола факультэта. Справы Эстафеты павінны штомесячна асвятляцца на факультэцкім стэндзе «Гаворыць Штаб Ленінскай Эстафеты». Кожная факультэцкая арганізацыя павінна мець «Дыскусійны клуб», штаб «КП», а курсавыя — пасты «КП», летапіс — «Кнігу слаўных спраў камсамольцаў факультэта». Летапіс трэба адкрываць з 22 красавіка 1966 года — з дня нараджэння Ул. І. Леніна і канчатковага прыняцця Ленінскай Эстафеты. Прадмовай да кнігі павінна быць пастанаўленне факультэцкага сходу, на якім была прынята Эстафета, а на фізфаку і матфаку — пастанаўленне канферэнцыі актыва аб прыняцці Эстафеты і «Зварот» тэарытычнай канферэнцыі БДУ. Кніга афармляецца як альбом.

Насценныя факультэцкія газеты павінны рэгулярна весці рубрыку «Крокі Ленінскай Эстафеты».

Эстафета падзяляецца на чатыры перыяды:

Першы—з 22 красавіка 1966 года па 7 лістапада 1967 года;

Другі — з 7 лістапада 1967 па 7 лістапада 1968 года;

Трэці — з 7 лістапада 1968 па 7 лістапада 1969 года;

Чацверты — з 7 лістапада 1969 па 7 лістапада 1970 года.

Вынікі будуць падводзіцца ў канцы кожнага перыяду. Пераможуць тыя камсамольскія арганізацыі, у якіх будзе: лепшая паспяховасць, лепшая навукова-даследчая работа, больш камсамольцаў будзе вучыцца на факультэце грамадскіх прафесій, займацца прапагандысцкай і грамадскай дзейнасцю, будзе найбольш актывістаў, удзельнікаў працоўнага семестра і найлепшая мастацкая самадзейнасць.

Факультэцкая арганізацыя-пераможца ў Ленінскай Эстафеце, будзе ўзнагароджана:

Пераходным Чырвоным Сцягам Ленінскага РК ЛКСМБ;

«Ганаровай Граматай» рэктарата і ўсіх грамадскіх арганізацый універсітэта;

Паездкай камсамольскага актыву ў Ленінград, Маскву, Кіеў (па выбару).

Самыя актыўныя члены арганізацыі-пераможцы будуць узнагароджаны памятнымі падарункамі — біяграфіяй Ул. І. Леніна і будуць занесены ў «Кнігу Пашаны Эстафеты БДУ».

*Свае думкі, пажаданні, прапановы і дапаўненні дасылайце ў рэдакцыю газеты і камітэт камсамола універсітэта.*

# БАЯВІТЫЯ, НАДЗЕЙНЫЯ, СМЕЛЫЯ

Усе мы зараз жывем пад уплывам дзвюх хвалюючых падзей — XXIII-га з'езда КПСС і Усесаюзнага форума камсамоліі нашай краіны. Вялікія магчымасці для творчай энергіі і ініцыятывы адкрылі яны перад намі. Для нас не можа быць іншага абавязку, як заўсёды і ва ўсім апраўдваць той давер Камуністычнай партыі і камсамола, які яны ўскладаюць на нас.

Камсамолія нашай вну з кожным годам папаўняецца цудоўнай моладдзю, якая прыходзіць да нас на вучобу з фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, са школ і тэхнікумаў. Сашлюся на такія факты. Толькі за апошнія пасляваенныя гады наша арганізацыя вырасла з трохсот да пяці тысяч чалавек. У нас штогод нараджаюцца многія цікавыя і карысныя справы, якія памнажаюць традыцыі універсітэта. Гэта і актыўны ўдзел на будоўлях цаліны, Сібіры, Беларусі, і ўсталяванне міжнародных сувязей паміж нашымі і замежнымі студэнтамі.

Юнакі і дзяўчаты нашай вну бяруць прыклад з лепшых выкладчыкаў універсітэта, удзельнікаў рэвалюцыйных баёў, герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Нашаму пакаленню не давялося хадзіць у атаку разам з камуністамі грамадзянскай вайны, не давялося ўдзельнічаць у разгроме фашысцкай чумы. Але яно праславіла сябе працоўнымі справамі.

У нас стала традыцыяй праводзіць лета на цалінных будоўлях і будоўлях рэспублікі. Толькі за мінулы год нашымі юнакамі і дзяўчатамі было выкарыстана ў будаўніцтве семсот тысяч рублёў капіталаўкладанняў. У вялікіх стэпавых аўдыторыях гіганцкага ўніверсітэта працы і мужнасці раслі не толькі валявыя і фізічныя якасці студэнтаў, але і жыццёвыя навыкі, абараняліся дыпломы на званне будаўніка, раслі і мужнелі будучыя высокакваліфікаваныя спецыялісты, як грамадзяне і патрыёты.

Студэнты нашага універсітэта сваёй працай і стараннасцю ў вучобе, удзелам у грамадскай рабоце памнажаюць слаўныя справы Ленінскага камсамола, нашай вну. Аб гэтым гаворым не толькі мы, але і нашы зарубежныя госці. Яны не могуць не зачаравацца цудоўнымі карпусамі, багатымі аўдыторыямі і выдатна абсталяванымі лабараторыямі, шчаслівай вучобай нашых студэнтаў.

Наведаўшы нядаўна наш універсітэт, адзін з кіраўнікоў французскай маладзёжнай арганізацыі сказаў: «Самае вялікае ваша багацце ў тым, што вы па сваёй прыродзе — калектывісты. Вы не атручаны індывідуалізмам. Вашы студэнты — людзі неабмежаваннага кругагляду, вельмі вясёлыя і радасныя, з высакароднай марай».

Мы ганарымся тым, што Камуністычная партыя, Савецкі ўрад давяраюць моладзі адказныя задачы. На гэтае давер'е юнакі і дзяўчаты адказваюць самаадданай працай, творчым энтузіязмам. Старэйшае пакаленне можа быць упэўнена за сваю змену. Змена расце баявітая, надзейная, смелая.

**Г. РЫЛЮК,**
**сакратар камітэта камсамола ўніверсітэта.**

**Нам. рэдактара П. ТКАЧОЎ.**

АТ 00944 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. № 737.